# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

УДК 821.161.3.09. – 3

*Т.І. Борбат*

## СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКАГА АДЛЮСТРАВАННЯ РЭАЛІЙ ВЯСКОВАЙ РЭЧАІСНАСЦІ ПЯРЭДАДНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПРАЗАІКАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1920-х – ПАЧАТКУ 1930-х гадоў

Беларускую літаратуру 1920-х гадоў не без падстаў называюць "пачаткам усіх пачаткаў" [6, с. 62]: літаральна за няпоўныя дзесяць гадоў у ёй выразна абазначыліся шляхі развіцця ўсіх родаў і жанраў, пашырыліся праблемна-тэматычныя абсягі. Напрыканцы 1920-х – пачатку 1930-х гадоў асабліва расквітнелі буйныя празаічныя жанравыя формы (аповесць і раман), што сведчыла аб шырокім франтальным руху айчыннай прозы да такога ўзроўню, падняўшыся на які, яна практычна магла адлюстроўваць усе сферы жыцця.

З сапраўдным мастацкім размахам увасаблялася ў нацыянальнай прозе тэма вясковага жыцця, да яе распрацоўкі звярталіся пісьменнікі розных творчых індывідуальнасцяў, схільнасцяў і густаў. У гэты перыяд былі апублікаваны "Зямля" і "Лявон Бушмар" К. Чорнага, "Язэп Крушынскі" З. Бядулі, "На абрэзках зямлі" і "Межы" С. Баранавых, "Мядзведзічы" К. Крапівы, "Праз гады" П. Галавача, "На чырвоных лядах" М. Лынькова і інш. У творах асэнсоўваліся надзённыя праблемы тагачаснай вёскі, даследаваліся заканамернасці грамадскага развіцця. Аднак да асваення адзначанай тэмы пісьменнікі ішлі рознымі шляхамі.

Сярод твораў на вясковую тэму своеасаблівасцю сюжэтна-кампазіцыйнай будовы, шырынёй ахопу жыццёвых праблем, глыбінёй пранікнення ў сутнасць сацыяльных і маральных з'яў вызначаецца раман К. Чорнага "Зямля" (1928). Раман, па сведчанні аўтара, быў задуманы як першая частка трылогіі аб жыцці беларускай вёскі. Аднак працу над ёй аўтар спыніў. Адной з прычын гэтага з'явілася адмоўная ацэнка твора, дадзеная ў артыкулах Р. Мурашкі "Дык дзе ж зямля?" і П. Галавача, А. Звонака "Супраць буржуазнай рэакцыі ў мастацкай літаратуры".

Ужо ў апавяданнях 1920-х гадоў пісьменнік сказаў свае слова пра вёску, селяніна, пра тагачасную грамадскую атмасферу – гэта

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“шматаблічная, шматгалосая вёска, пярэстая па сацыяльнаму складу і нельга катэгорыямі серадняка, бедняка, кулака вызначыць яе склад” [8, с. 65].

Як адзначае П. Глебка, К. Чорны ў 1943 г. так вызначыў змест і пафас рамана “Зямля”: “Замілаванне да роднай зямлі, да прыроды, харастве беларускіх простых людзей” [1, с.73]. Гэта прызнанне як нельга лепш раскрывае вытокі незвычайнай эмацыянальнасці, глыбокага лірызму, што пранізваюць увесь твор.

Раман “Зямля” – своеасаблівая “паэма ў прозе пра паэтычнае і празаічнае, заканамернае і выпадковае, камічнае і трагічнае ў жыцці беларускай дакалгаснай вёскі” [4, с. 34]. У творы аўтар адлюстраваў пачатковы этап сацыяльных пераўтварэнняў у вёсцы, калі селянін стаў свабодна гаспадарыць. Пісьменнік паэтызуе яго прыхільнасць да зямлі. Аднак, на думку аўтара, зямля – гэта не толькі частка прасторы, якая корміць чалавека. Зямля – гэта сімвал радзімы, сімвал маральнай сілы, якая спрадвеку падтрымлівала селяніна ў цяжкія гадзіны. Зямля – гэта і самі вяскоўцы, іх узаемаадносіны. На гэтай зямлі ад веку людзі нараджаюцца, жывуць, паміраюць, зведаўшы рэдкія хвіліны радасці.

Кампазіцыйна раман складаецца з асобных малюнкаў сялянскага жыцця, асобных сцэн і эпізодаў, кожны з якіх мог бы паслужыць асновай для закончанага апавядання з напружана-драматычным сюжэтам (напрыклад, апавяданне пра нялёгкі лёс і драматычную смерць Мацвеіхі; эпізод з папом на хрэсьбінах ў Себастыяна). Раман жа не вызначаецца сюжэтнай напружанасцю, драматызмам у развіцці падзей. Цэласным мастацкім арганізмам яго робіць моцнае аўтарскае пачуццё любові да роднага краю, людзей; упэўненасць, што гэтыя людзі заслугоўваюць лепшай долі. З кожнай старонкі твора гучыць замілаванне пісьменніка да роднай зямлі: ці апісвае К. Чорны, як нараджаецца пачуццё кахання ў дзяўчыны, ці распавядае пра сварку жанчын, ці перадае размову сялян у сельсавеце; гучыць вера ў людзей працы і заклік да новага жыцця.

Пісьменнік паступова разгортвае перад чытачом малюнкі жыцця невялікага беларускага мястэчка. Раман пачынаецца са сцэны сходу, дзе вырашаецца пытанне аб перамеры зямлі, што прылягае да балота. Ужо з самага пачатку аўтар выдзяляе герояў, за лёсам якіх будзе сачыць – бедняк Мацвей, яго заможны брат Себастыян, сын Мацвея Юрка, які сябруе з Юзікам; стары Тамаш, дзяк, што пакідае сваю пасаду і пачынае кіраваць музыкальнай капэлай; кум Барановіча Вашынковіч, Мікалай Крываносы, Хоня і малады хлопец Клемусь.

Кузьма Чорны ў рамане, як заўважае І. Навуменка, “не вельмі бярэ да ўвагі падзел людзей на беднякоў, сераднякоў і кулакоў” [8, с. 67]. У “Зямлі” дзейнічаюць толькі сяляне. Цяжкае і беспрасветнае іх жыццё



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(у Алесевай хаце нават драўлянай падлогі няма) праходзіць у працы. Не заўсёды маюць яны неабходнай вопраткі: стары Тамаш ходзіць у апорках, набывае боты толькі перад самай смерцю. Мацвееў сын Юрка носіць стары выліналы кажушок, зрэбную пафарбаваную начорна верхнюю сарочку і нават у замаразкі ходзіць босы. Раскрываючы свет дзяцінства, пісьменнік паказвае, што дзеці мала бачаць радасці, уцех. Так, на вачах Юркі памірае падарваная цяжкай працай маці, даходзіць стары конь, які з'еў усе зубы. Дзве сястрычкі хлопца не маюць ніякіх цацак, адзіная іх забава – пакачаць гарбуз па падлозе. Была адзіная радасць у Юркі, калі бацька, нарэшце, сшыў яму боты. Аднак і з гэтай радасці вынікае драма.

К. Чорны імкнецца намаляваць тыповыя праявы жыцця беларускай вёскі. Напрыклад, эпізод, які яскрава сведчыць аб тым, як харчуецца бедная частка вёскі:

"Юрка, прыпёршыся плячом да разгатае грушы, расказваў:

*<...> Пазаўчора мне вельмі захацелася было сала, дык я сам палез у суднік ды адрэзаў сабе кавалачак, дык тата калі ўбачыў, дагнаў мяне каля хлява, ды калі дасць мне нечым па руках, дык я аж заплакаў. Яйбогу.*

*А ў вас сала многа?*

*Нашто ён мяне біў? Я ж і сам бачу, што сала да каляд засталося толькі адзін кавалачак <...>.*

*А з чым вы варыце?*

*На абед дык крупнік з малаком або картопля з малаком. А раніца – дык у нас расол ёсць і гуркі"* [9, с. 338].

Сваркі ў доме, сваркі між суседзямі, а таксама нячастыя сялянскія святы, быт, паўсядзённасць вёскі перададзена ў рамане ва ўсёй паўнаце і шырыні.

Аднаасобная вёска "з разбітым на палоскі полем, з гумнамі на мяжы агародаў, з паплавамі, на якіх часта сыходзяцца местачкоўцы – размаўляюць, дазнаюцца навін, спрачаюцца, і гэтыя спрэчкі ледзь да боек не даходзяць, вёска, разбуджаная рэвалюцыяй, марудна дбае пра новае жыццё" [8, с. 70]. Пісьменнік не дэкларуе пра перамены, піша пра іх, не выходзячы з агульнага патоку жыцця.

У творы не пададзена яркіх малюнкаў класавай барацьбы. Сялянскае жыццё паказана ва ўсёй яго натуральнасці, без уступак палітычнай кан'юнктуры. У "Зямлі" пісьменнік здолеў адстаяць сваю ўласную праўду пра людзей вёскі, не скажоную ідэалагічнымі шорамі. Зямля дрэнна корміць беларускага селяніна, хоць ён і ўкладвае ў яе вялікія сілы і намаганні.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як шырокае палатно аб жыцці беларускай вёскі напярэдадні "вялікага пералому" быў задуманы і раман К. Крапівы "Мядзведзічы". У творы спалучаліся праўдзівасць паказу побыту сялян са смеласцю выяўлення складанасцей сацыяльна-палітычных адносін у тагачаснай Беларусі; псіхалагічная дакладнасць абмалёўкі характараў герояў – з уменнем перадачы каларыту вясковай рэчаіснасці, у якой суседнічаюць душэўнае парыванне, бескарыслівасць і звераватасць, смех і слёзы, радасць і гора.

К. Крапіва паказвае шматлікія праявы адсталасці ў жыцці вяскоўцаў, але ж яго пазіцыя аптымістычная. Вёска хіліцца да новага жыцця, імкнецца пазбавіцца спрадвечнай забітасці, сварак і грызні. Сяляне шчыра жадалі перамен, *"каб кожны не дрыжэў над сваёй крыхой, каб не рваў у другога, каб не калаціўся кожны раз, думаючы пра тое, як будуць жыць яго дзеці і хто яму будзе дапамагаць пад старасць"* [5, с. 134]. Разам з тым новае трывожыла герояў рамана, прымушала разважаць пра магчымыя наступствы калектывізацыі. Час паказаў, што гэтыя трывогі не былі беспадстаўнымі: калектывізацыя, вырашыўшы адны праблемы, нарадзіла шэраг іншых. Гэтыя праблемы аказаліся настолькі складаныя, што пісьменнік, які заўсёды вызначаўся праўдзівасцю адлюстравання рэчаіснасці, не рызыкнуў брацца за іх мастацкае адлюстраванне і асэнсаванне. І не столькі з-за перастрахоўкі, боязі сапсаваць адносіны з уладамі, колькі з-за сумненняў: ці здолее ўтрымаць узровень мастацкасці. У выніку напісанне рамана "Мядзведзічы" завяршылася першай яго часткай.

Чытаючы раман, ствараецца ўражанне, што пісьменнік "нібы кінакамерай занатоўвае ўсё, што патрапляецца ў яе аб'ектыў. Гэтая своеасаблівая, менавіта пісьменніцкая кінакамера пераходзіць ад адной дзеючай асобы да другой, ад аднаго прадмета да другога, часам запыняючыся ненадоўга, а іншым разам углядаючыся ўважліва, фіксуючы ўсё, нават самыя нязначныя падрабязнасці" [2, с. 149].

У творы К. Крапіва апавядае пра час, калі пачынаўся складаны, часам драматычны, працэс перабудовы вёскі на новы лад, падаюцца і эпізоды з перыяду грамадзянскай вайны, звязаныя з лёсам жыхароў гэтай вёскі.

Пісьменнік раскрывае чалавечыя характары ў розных абставінах, паказвае ўзаемаадносіны паміж сямейнікамі, суседзямі. Яркімі і ўражлівымі падаюцца масавыя сцэны. Так пасля пакражы коней людзі выйшлі на вуліцу, каля хаты Верамейчыка сабраўся ледзьве не натоўп: *"Кожнаму хацелася сказаць, што ён ведаў, і самому пачуць нешта яшчэ новае, нячутае, а можа, і чутнае, але расказанае нанова, з новымі*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*падрабязнасцямі і меркаваннямі. Разам з гэтым успаміналіся розныя іншыя падобныя здарэнні <...>”* [5, с. 114].

Здараецца, што вяскоўцы сыходзяцца ў гурт без дай прычыны, гаворка, як звычайна, пераключаецца з тэмы на тэму, але ж абавязкова пераходзіць на сучасныя, хвалюючыя жыхароў Мядзведзічаў справы.

Пісьменнік засяроджвае ўвагу на старасвецкім укладзе жыцця сялян, іх норавах і звычках. Недаверлівасць, варожасць, злосць. *“ваўкаватая панурасць... заўсёды панавала ў Верамейчыкавай хаце. <...> калі нават блізкія між сабой людзі, як муж з жонкаю, не асмельваюцца пры другіх сказаць адно аднаму ласкавае слова”* [5, с. 120]. Калі ж панурасць гэта даходзіла да крайнасці, то *“тады людзі не маглі нагаварыцца адно з адным. Гаварылі ўсе адразу. Крычалі, лемантавалі, скавыталі, скрыгіталі зубамі з бруднай лаянкаю, са страшнымі кленічамі. Зычалі адно аднаму такое, што каб хаця дваццатая доля таго сталася, дык бы ўсіх іх назаўтра павыцягалі на могілкі <...>”* [5, с. 130]. Так і Тадора Верамейчык з любой нагоды насядае на нявестку Зосю, Юзікаву жонку. *“Хто гэта парсюку ўчора мяшаў? – буркнула старая, глянуўшы ў ражку, у якой на дне было са жменьку пакуцанай лычамі свіной яды.*

*– Я мяшала, – адказала, не адварочваючыся ад печы, Зося <...>.*

*– Каб табе мазгі ў галаве перамяшаліся,– пажадала ёй старая...*

*– Гультай ты! Што ж ты калі па-людску зробіш? Табе ж цяжка рукі завярнуць, каб табе нечага гэту яндоўку тваю на патыліцу завярнула. Толькі з кубельца, дык ты б цягала, каб табе кішкі ды вантробы выцягнула”* [5, с. 31].

Мядзведзічы – гэта тыповая беларуская вёска. К. Крапіве, як і К. Чорнаму ў рамане “Зямля”, удалося даць мастацкую замалёўку вясковага побыту, звычаяў, прычым надзвычай дакладна і каларытна.

Пераканальна паказана ў “Мядзведзічах” схільнасць старой вёскі да плётак і неверагодных перабольшванняў. Ахвярай брыдкіх плётак “на палітычнай падкладцы” становіцца ў рамане Зося, якой такім чынам помсцяць за тое, што яна падказала чырвонаармейцам, дзе хаваюцца дзезерціры: *“А ў скорасці пайшлі па вёсцы пра Зосю брыдкія плёткі. Нехта бачыў, што аднаго дня на змярканні Зося нібыта шла праз вёску, несучы нешта пад крысом кажуха: што дайшоўшы да Піперманіхі, яна крадком аглянулася і пасля хуценька ўскочыла да яе ў хату. Тады ўспомнілі і пра тое, як тыдняў шэсць таму назад прыязджалі з мястэчка ў Мядзведзічы ставіць спектакль. Як на гэтым спектаклі мядзведзіцкі настаўнік круціўся ўсё каля Зосі <...>”* [5, с. 65–66]. Таксама атручваюць Зосіна жыццё насцярожанасць і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

падазронасць старых – Тадоры і Кастуся, якія заўсёды пануюць у сям'і Верамейчыкаў[1]. Таму Юзік марыць аб тым, каб у кожнай сялянскай хаце можна было вольна сказаць вясёлае слова, пажартаваць. Юзік шмат чытае, з газеты "Беларуская вёска" пераймае агратэхнічныя навінкі, але кнігі і газеты не маглі падказаць, што трэба зрабіць, каб не грызліся свякроў з нявесткай, брат з братам, бацька з сынам. Тым часам жыццё мянялася. *"Гэта было тое новае ў вёсцы, да чаго ён ўпотай далучаў і сябе, што канкрэтна звязвалася з вобразамі Сцёпкі, Шуры ды іншых некаторых і яшчэ тое, часта не зусім для яго выразнае, што не столькі бачылася, колькі адчувалася; і тое новае, хвалі якога патрошку, але ўсё смялей падмываюць грунт старога вясковага ўкладу <…>"* [5, с. 131].

У К. Крапівы не было "ніякіх ілюзій наконт рэальных маштабаў гэтага працэсу, які па драматызму, накалу страсцей не саступаў гадам грамадзянскай вайны", але варта адзначыць, што пісьменнік нават не паспрабаваў зрабіць выгляд, нібыта яму ўсё зразумела. Прынамсі, зазначае С.Лаўшук, ён быў далёкі ад думкі, "што складанае вязьмо сельскіх праблем можна вырашыць адным махам: якім кепскім не быў уклад вясковага жыцця, але ён складаўся вякамі і імгненна рэфармаваць яго – уяўлялася больш чым праблематычным" [3, с. 312].

Дз. Бугаёў у артыкуле "Кандрат Крапіва" слушна адзначае: "Вылучаючы праўдзівасць у паказе вёскі як асноўную якасць "Мядзведзічаў", крытыкі не мелі магчымасці сказаць, што яна, тая праўдзівасць, усё ж была няпоўнай" [2, с. 149]. Літаратуразнаўца пераглядае і свае ранейшыя сцвярджэнні: "На самой жа справе і на пэўныя кампрамісы ў сваім рамане пісьменнік ішоў, і жыццё беларускай вёскі пісаў хоць у многім праўдзіва, але не зусім і не ва ўсім так, "як яна бачылася яму самому". Уласнае пісьменніцкае бачанне ў "Мядзведзічах" яўна карэкціруецца ўсё тым жа абавязковым тады марксісцкім поглядам на вёску і селяніна" [2, с. 149].

Разам з тым раман К. Крапівы "Мядзведзічы", як і многія творы К. Чорнага, ураджвае багаццем фактычнага матэрыялу. К. Крапіва, раскрываючы сацыяльныя канфлікты беларускай вёскі, не мінае яе быту, яе маральных і псіхалагічных канфліктаў, прычым паказвае іх не ізалявана ад сацыяльных праблем, а ў цеснай сувязі. Пакутлівыя дысанансы жыцця, жорсткасць, падседжванні, зайздрасць – усё гэта пісьменнік паказваў з бязлітаснай адкрытасцю, у якой аднак няма і ценю зласлівасці, нядобразычлівасці.

[1] К. Крапіва ў апісаннях дзікасцей побыту герояў рамана не згушчае фарбы. Мачаха Юзіка Верамейчыка Тадора была падобная на яго мачаху Домну – трэцюю жонку бацькі. Ад яе "прыдзірак, сварак жонка пісьменніка вымушана была ўцякаць да мужа ў Мінск, дзе ў яго, інструктара ваеннай школы, не было ні кала, ні двара" [3, Т. 2, с. 311].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рэалістычную плынь штодзёншчыны з усімі яе малымі і больш значнымі падзеямі, з дакладным маральным і бытавым становішчам чалавека ўзнаўляе М. Лынькоў у сваім незакончаным рамане "На чырвоных лядах" (1933)[2].

У рамане паказаны беларуская вёска і мястэчка ў гады Першай сусветнай вайны. Аднак у пісьменніка быў намер грунтоўна паказаць не толькі падзеі рэвалюцыі, але і перамены ў сялянскім лёсе пасля яе, аб гэтым сведчыць і назва аповесці. Ляды – гэта лясныя высечкі, у выніку раскарчоўкі якіх ствараецца новае поле, прыдатнае для сяўбы. У М. Лынькова ляды чырвоныя – меліся на ўвазе высечкі і пасеў, ажыццёўленыя пасля бальшавіцкай рэвалюцыі. Пісьменніцкі замах быў вялікі. Аднак другая кніга не была напісана, а першую пісьменнік так і не передрукаваў[3].

Кампазіцыя аповесці даволі своеасаблівая: кожная глава ўяўляе сабой абмалёўку жыцця пэўнага селяніна. Маналогі, дыялогі і разважанні местачкоўцаў адлюстроўваюць іх мары, нараканні на лёс, імкненні змяніць рэчаіснасць. Пісьменнік спачувае простаму чалавеку, які намагаецца палепшыць сваё жыццё, але ён крытычны ў адносінах да лайдакоў, калі тыя нават і з'яўляюцца прадстаўнікамі вясковай беднаты.

У мястэчку, з яго традыцыйным складам пераважна сялянскага жыцця, цячэ спрадвечная плынь народнага побыту. Штодзённы клопат пра выжыванне часам перабіваецца хвіліннымі момантамі скупой радасці і весялосці.

Багацейшыя гаспадары мястэчка без жалю эксплуатуюць беднейшых. Нават парабкам у больш заможных суседзяў жывецца горш, чым у паноў, – суседзі карыслівыя нават у дробязях. Аднак, на думку В. Каваленкі, "агульны сацыяльна-псіхалагічны клімат у мястэчку не безнадзейны. Па-першае, парабкі любяць працу незалежна ад таго, колькі ім плацяць, а працавіты чалавек заўсёды надзея будучыні. Па-другое, у некаторых маладых людзей зараджаюцца і выспяваюць першапачатковыя духоўныя судакрананні з жыццём" [3, с. 394]: *"– Трохі з прыдурам... – кажа пра свайго парабка дзядзька Іван. // Хіба не з прыдурам, калі вось угледзіцца часам у што і глядзіць. <...>. Лыпне вось так вачамі бялёсаватымі і нібы ўглядаюцца гэтыя вочы не на свет божы, а ў нутро сваё, і толькі потым ужо спытае: // Аб чым гэта вы? // Спытае і ўглядаецца здзіўлена. // – Зрок у яго нутраны... – кажуць бабкі-суседкі. А які гэта зрок, запытай іх, і не адкажуць"* [7, с. 279]. І невыпадкова менавіта парабак Нупрэй заступаецца за салдатак, якіх крыўдзіць староста.

[2] "На чырвоных лядах" М. Лынькоў назваў аповесцю, аднак большасць даследчыкаў твор разглядаюць як раман.

[3] Застаўся ненапісаным і раман "Сенька Сокал", урыўкі з якога друкаваліся ў 1937 годзе. Яны сведчаць, што новы раман, як слушна падкрэсліваў Ф. Куляшоў, хутчэй за ўсё разглядаўся аўтарам як працяг "Чырвоных лядаў".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У рамане паказваецца і барацьба супраць эксплуатататараў, але аўтар не паказвае рост свядомасці герояў. Падпал панскага гумна, крадзеж жывёлы – гэта тыповыя сродкі помсты пану з боку сялянства, якія адпавядалі яго магчымасцям і вынікалі з яго псіхалогіі.

Раман М. Лынькова "На чырвоных лядах" па жанрава-стылёвых асаблівасцях блізкі да рамана К. Крапівы "Мядзведзічы", у творах шмат гумару, натуральных сатырычных інтанацый.

Так, Жагула і Грамабой дамовіліся аб вяселлі сваіх дзяцей, а потым, калі стала вядома, што ў Жагулы зямлю абрэжуць, для сына Грамабояў Міколы жаніцьба на непрыгожай, нялюбай Жагулавай дачцэ цяпер губляе сэнс – зямлі, з-за якой і пачынаўся хаўрус, усё роўна не прыбавіцца. Вяселле разладжваецца. Але ж Грамабоі не папярэдзілі Жагулу, і ліпавае вяселле ладзіцца. Сцэна вяселля намалявана сатырычнымі фарбамі, аўтарская "атэстацыя"вясельнікаў выразная: *"Народ усё шляхтаваты, на чужую пачостку сквапны, да банкетаў вялікі ахвотнік, а таму ў такіх выпадках заўсёды акуратны"* [5, с. 208].

Сатырычная аўтарская інтанацыя мяжуе з прамой агідай, калі распавядаецца пра вынікі "змагання" Жагулавых шляхтаватых гасцей з алкаголем у духу Хвядоса, што меў чырвоны нос, з аднайменнай паэмы К.Крапівы. *"Праз гадзіну з хаты праз адчыненыя вокны падыхала, як з бровара, а ў лесе рэха перадражнівала дзікія, п'яныя спевы. Пад вечар усё сціхла, толькі зрэдку чулася невыразнае мармытанне, соннае чвяканне губамі альбо стагноты. Нібы мерцвякі валяліся па адным на мураве ў двары, на ганку, на ўзмежку каля раллі,"* [5, с. 209] – зазначае празаік, выяўляючы свае пачуцці не столькі праз непасрэдна аўтарскую эмацыянальную ацэнку, колькі праз падбор адпаведна афарбаваных эпітэтаў ("дзікія, п'яныя спевы", "невыразнае мармытанне", "соннае чвяканне" і інш.), праз дакладна выпісаныя дэталі малюнка.

Гумар і сатырычныя інтанацыі ў рамане "На чырвоных лядах" і рамане "Мядзведзічы" самі па сабе ўжо сведчылі, што ў гэтых творах жыццё бярэцца шматпланава, ва ўсім багацці эмацыянальных праяў чалавечай душы.

Такім чынам, у другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гадоў узмацняецца цікавасць пісьменнікаў да вясковай тэматыкі, што звязана з пачаткам пераломнага этапа ў жыцці сялянства. Працэсы, што адбываліся ў гэты час у вёсцы, сацыяльная дэферынцыяцыя, абвастрэнне класавай барацьбы, сацыяльныя, этычныя, псіхалагічныя праблемы, – гэта ўсё з'яўлялася багатым матэрыялам, які літаратура павінна была ўзняць і эстэтычна асэнсаваць. Нягледзячы на тое, што партыя пільна сачыла за



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

літаратурным працэсам, бо разглядала і выкарыстоўвала літаратуру як сродак выхавання людзей у патрэбным духу, тым не менш у літаратурнай скарбонцы адзначанага перыяду былі і асобныя праўдзівыя творы пра жыццё беларускага сялянства напярэдадні "вялікага пералому".

## Літаратура


1. Беларуская савецкая проза : Раман і аповесць : зб. арт. / рэд. : І. Барысенка, П. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 431 с.
2. *Бугаёў, Дз.* Кандрат Крапіва / Дз. Бугаёў // Спавядальнае слова : літ. крытыка, успаміны / Дз. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – С. 147–158.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Бел. навука, 1999 – 2004. – Т. 2. Літаратура перыяду 1921 – 1941 гг. – 1999. – 903 с.
4. *Дасаева, Т.* Улада зямлі : мастацкае ўвасабленне праўды жыцця ў рамане "Зямля" і аповесці "Лявон Бушмар" К. Чорнага / Т. Дасаева // Беларуская мова і літаратура. – 1990. – № 6. – С. 34–37.
5. *Крапіва, К.* Мядзведзічы / К. Крапіва // Збор твораў : у 6 т. – Мінск : Маст. літ., 2004. – Т. 3 : Раман. П'есы. Апавяданні. – 430 с.
6. *Крот, М.* Пошук праўды працягваецца / М.С. Крот // Жывыя старонкі мінулага : вучэб.-метад. дапам. для наст. – Мінск : Маст. літ., 1998. – С. 115–138.
7. *Лынькоў, М.* Збор твораў : у 8 т. / М. Лынькоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Т. 3: Аповесці і раманы. – 638 с.
8. *Навуменка, І.* Ранні Кузьма Чорны (1923 – 1929) / І.Я. Навуменка. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 95 с.
9. *Чорны, К.* Зямля / К. Чорны // Збор твораў : у 8 т. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 3: Раманы. – 532 с.


тронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулеш